11. Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Міёрскага раёна. – Мінск : Беларус. навука, 1998. – 630 с.; Памяць: Гісторыка-дакументальная хроніка Браслаўскага раёна. – Мінск : Паліграфафармленне, 1998. – 710 с.
12. Паўлаў М. Бачэйкаўскі палац і парк. – Віцебск: друк. імя Камінтерна,1989. – 8 с.
13. Пракаповіч І. Чароўны край – Пастаўшычына : (гісторыка-краязнаўчы курс «Паставазнаўства»). – Мінск : Кнігазбор, 2009. – 304 с.
14. Регионы Беларуси : энциклопедия. В 7 т. Т. 2. – Витебская область. В 2 кн. Кн. 2 / редкол.: Т.В. Белова (гл. ред.) [и др.]. – Минск : БелЭн, 2011.
15. Сергачоў, С. А. Сядзібная архітэктура Віцебшчыны / С. А. Сергачоў // Помнікі гісторыі і культуры Беларусі. – 1972. – № 1. – С. 22–25.
16. Страчаная спадчына / Т. В. Габрусь, А. М. Кулагін, Ю. У. Чантурыя, М. А. Ткачоў; уклад. Т. Габрусь. – Мінск : Беларусь, 2003. – 351 с.
17. Януш, І. Адкуль мы пайшлі. З гісторыі лепельскага краязнаўства // Лепельшчына / уклад. В. Тухто. – Мінск, 2016. – С. 74–97.
18. Усадьбы известных людей на Полотчине. – Минск : Нацыянальнае агенцтва па турызму, 2007.
19. Федорук, А.Т. Садово-парковое искусство Беларуси / А. Т. Федорук. – Минск : Ураджай, 1989. – 247 с.
20. Федарук А. Культурна-гістарычная каштоўнасць і сучасны стан шляхецкіх сядзіб Віцебшчыны // Віцебскі сшытак. – 2000. – №. 4. – С. 84–89.
21. Федорук, А. Старинные усадьбы Берестейщины / А. Федарук. – Минск : БелЭн, 2006. – 575 с.
22. Цехановецкий, В.М. Хроника одного поместья: Бочейково / В.М. Цехановецкий. – Витебск, 1905.
23. Якімовіч, Ю. Беліцкая сядзіба // Энцыклапедыя літаратуры і мастацтва Беларусі. – Мн., 1984. – Т. 1. – С. 419; Ён жа, Іванская сядзіба // Тамсама. – Т. 2. – С. 553; Ён жа, Копыская сядзіба // Тамсама. – Т. 3. – С. 106–107.
24. Якімовіч, Ю. Архітэктурны ансамбль у Лынтупах / Ю. Якімовіч // Віцебскі рабочы (ВР). – 1992. – № 47, 48; Ён жа. На Дубровенцы і Дняпры [г.п. Дуброўна] // ВР. – 1992. – № 139. – С. 3; У далёкім васямнадцатым стагоддзі [Дубровеншчына] // ВР. – 1993. – № 117. – С. 5.
25. Aftanazy, R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. – Wyd. 2. – Cz. 1. Wielkie Księstwo Litewskie, Inflanty, Kurlandia. – T. 1. Województwa mińskie, mścisławskie, połockie, witebskie. – Wrocław: Ossolineum, 1996. – 335 S.; Aftanazy, R. Dzieje rezydencji na dawnych kresach Rzeczypospolitej. – Wyd. 2. – Cz. 1. Wielkie Księstwo Litewskie, Inflanty, Kurlandia. – T. 4. Województwo wileńskie. – Wrocław: Ossolineum, 1993. – 547 S.

**Тогулева А.Д.**

## АГЛЯД КРЫНІЦ І ГІСТАРЫЯГРАФІІ 1920-х гг. ПА ПЫТАННІ ЎЗНІКНЕННЯ І ДЗЕЙНАСЦІ БЕЛАРУСКАЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ГРАМАДЫ

Важнай крыніцай звестак па гісторыі беларускай нацыянальнай партыі – Беларускай Сацыялістычнай Грамады з'яўляецца тая навукова-гістарычная спадчына, якая была створана ў 1920-я гады сябрамі БСГ і іх сучаснікамі.

У 1918 г. у Маскве выйшаў у свет нарыс вядомага дзеяча беларускага руху старшыні Беларускага абласнога камітэта Я.С. Канчара "Из истории общественных, национальных и революционных движений белорусов. Часть II" [21]. Нарыс змяшчае надзвычай цікавы матэрыял аб падзеі выключнай важнасці ў жыцці беларускага народа – 1-м Усебеларускім з'ездзе, непасрэдным ініцыятарам і ўдзельнікам якога быў сам аўтар. Да свайго нарысу Я. Канчар дадае цэлы шэраг рознаадрасных пратэстаў супраць гвалтоўнага разгону з'езда бальшавікамі, сярод якіх ёсць і пратэст БСДРП, якая ўтварылася з левага крыла Петраградскай арганізацыі БСГ.

У 1919 г. пад грыфам Петраградскага аддзелу Белнацкама выйшла другая праца Я. Канчара "Белорусский вопрос" [20]. Тэматыка гэтай кнігі надзвычай шырокая – тут і статыстычныя дадзеныя пра Беларусь, і кароткі агляд асноўных этапаў гісторыі беларускага народа, яго культуры. Галоўную ўвагу аўтар канцэнтруе на аналізе асноўных патрабаванняў беларускага вызваленчага руху, абгрунтаванні права насельніцтва Беларусі на стварэнне ўласнай дзяржавы.

Агульныя пытанні беларускага нацыянальна-вызваленчага руху на пачатку XX ст., а таксама пытанні аб узнікненні і дзейнасці БСГ разглядаюцца ў працах Я. Варонкі, А. Луцкевіча, Ф. Турука, У. Пічэты [6; 27; 30; 28]. Публікацыі гэтых аўтараў змяшчаюць каштоўны матэрыял, асабліва кніга Ф. Турука "Белорусское движение", якая побач з аўтарскім тэкстам мае дадатак у складзе 31 дакумента. Сам Ф. Турук быў членам БСГ, дэлегатам III партыйнага з'езда і кандыдатам у ЦК БСГ. У сваёй працы ён дае агляд гісторыі БСГ з моманту яе ўзнікнення ў 1903 г. і да яе распаду ў 1918 г.

Крыніцай звестак аб Беларускай Сацыялістычнай Грамадзе з'яўляюцца публікацыі А. Бурбіса "Кароткі агляд беларускага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху" [29] і "БСГ у першым перыядзе яе працы" [5]. Аляксандр Бурбіс – гэта чалавек, які прымаў актыўны ўдзел ў стварэнні БСГ у 1903 г., быў членам ЦК БСГ у 1906 г., а пасля лютага 1917 г. узначальваў Маскоўскую арганізацыю БСГ. З гэтай прычыны яго працы па гісторыі першай беларускай нацыянальнай партыі маюць выключнае значэнне. Яны змяшчаюць багаты фактычны матэрыял аб дзейнасці БСГ, а таксама і асабістыя вывады аўтара ў адносінах да таго ці іншага пытання. Гэтыя публікацыі напісаны не паводле дакументальных даных, а паводле ўспамінаў сябра партыі. З прычыны гэтага, ён аб усіх падзеях у гісторыі БСГ кажа ў агульных рысах, не дастаткова дэталізуе той ці іншы бок, або з'яву з яе жыцця і дзейнасці.

Репозиторий ВГУ

У 1922–1928 гг. у гістарычным і грамадска-палітычным часопісе "Полымя" з'явіўся цыкл артыкулаў вядомага беларускага дзеяча З.Х. Жылуновіча. Яны былі прысвечаны гісторыі нацыянальнага руху, самавызначэнню беларускага народа. З.Х. Жылуновіч у сваіх работах дае аналіз этапаў развіцця, што былі пройдзены беларускай інтэлігенцыяй з пачатку XX ст., і падрабязна характарызуе тую з яе плыняў, на якой, па яго меркаванню, пачаў "грунтавацца" нацыянальна-вызваленчы рух у краі. На прыкладзе палітычнага лёсу тыповага беларускага ітэлігента і нацыянальнага дзеяча А. Бурбіса, ён разгледзіў увесь складаны комплекс нацыянальнага і сацыяльнага развіцця тагачаснай Беларусі [11; 12; 14].

Асаблівую каштоўнасць для вывучэння гісторыі БСГ маюць тыя гісторыка-публіцыстычныя артыкулы З. Жылуновіча, у якіх аўтар засяродзіў увагу на развіцці беларускага вызваленчага руху, яго сацыяльным і партыйным складзе, канчатковых мэтах, стратэгіі і тактыкі розных плыняў, груп, суполак, што ўдзельнічалі ў ім на этапе Лютаўскай і Кастрычніцкай рэвалюцый. З. Жылуновіч засяроджвае сваю ўвагу на працы Беларускай Сацыялістычнай Грамады, асабліва яе Петраградскай арганізацыі, лідэрам якой ён у той час з'яўляўся [7–10; 15].

Асобныя пытанні нацыянальна-вызваленчага руху і гісторыі БСГ былі закрануты ў зборніку "Беларусь", што выйшаў у свет у 1924 г. у сувязі з пяцігоддзем абвяшчэння БССР [4]. Тэма кнігі надзвычай шырокая. Тут і гісторыя грамадска-палітычнага руху, і стан эканомікі дарэвалюцыйнай і паслярэвалюцыйнай Беларусі, і развіццё нацыянальнай культуры. Асаблівай увагі, на наш погляд, заслугоўваюць змешчаныя ў гэтым зборніку артыкулы З. Жылуновіча, У. Ігнатоўскага, якія непасрэдна датычацца дзейнасці БСГ [16; 17].

У 1920-я г.г. у свет выходзіць шэраг артыкулаў, якія змяшчаюць дакументальны матэрыял па гісторыі БСГ. З. Ангарэціс, М. Мялешка у сваіх работах засяроджваюць увагу на агітацыйнай літаратуры БСГ часоў першай расійскай рэвалюцыі 1905–1907 гг. [3; 26]. З. Ангарэціс, які абапіраецца на архівы КП Літвы, у сваім артыкуле дае спіс пракламацый, лістовак, рэвалюцыйных вершаў, што выходзілі ад імя БСГ. М. Мялешка ў сваёй публікацыі разглядае дзейнасць БСГ сярод сялянства на працягу 1905 г. і таксама прыводзіць шэраг пракламацый Грамады, якія былі адрасаваны сялянам Беларусі. Цікава тое, што аўтары гэтых артыкулаў прыходзяць да супрацьлеглых вынікаў у сваіх даследаваннях. Калі З. Ангарэціс лічыць, што "у 1905–1906 гг. Беларускай Сацыялістычнай Грамады, як сапраўднай партыі не было, былі толькі радыкальныя буржуазныя беларускія інтэлігенты, купленыя ў літаральным сэнсе грашовымі мяшкамі" [3, с. 5], то М. Мялешка вельмі станоўча ацэньвае дзейнасць Грамады і адзначае, што "у рэвалюцыйным уздыме працоўных у 1905 г. БСГ прымала актыўны ўдзел" [26, с. 152].

Асаблівую каштоўнасць маюць публікацыі гісторыка А. Шлюбскага, у якіх ён дае багаты дакументальны матэрыял па гісторыі БСГ. Дзякуючы гэтаму гісторыку, мы маем у сваім распараджэнні праграму БСГ, што была прынята на II з'езде ў 1906 г., а таксама цікавыя матэрыялы адносна існавання першых беларускіх легальных газет "Наша Доля" і "Наша Ніва" [32–34].

У 1920-я гг. і пазней друкаваліся работы А.Р. Чарвякова, у мінулым члена Петраградскай арганізацыі БСГ, потым кіраўніка Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі, якая была створана на аснове Нарвскай арганізацыі БСГ, а ў 1919 г. камісара асветы ў часовым рабоча-сялянскім урадзе Беларусі.

У кнізе "За Савецкую Беларусь" [31] Алесь Чарвякоў дае кароткі, канспектыўны агляд галоўных этапаў рэвалюцыйнай барацьбы на Беларусі. Аўтар закранае дзейнасць БСГ і праблемы беларускай нацыянальнай дзяржаўнасці, але для яго нацыянальнае пытанне – толькі частка агульных пытанняў класавай барацьбы. Як, у цэлым, рэакцыйную з'яву ацэньвае А.Чарвякоў імкненне беларускіх дзеячоў як да аўтаноміі, так і да незалежнасці краю [31, с. 38–39]. Палемізуючы з А. Бурбісам, А. Чарвякоў, насуперак фактам, прыходзіць да высновы, што "I Усебеларускі з'езд складаўся выключна з ворагаў Савецкай улады і быў настроены супраць Саветаў" [31, с. 47].

Складаную тэму дзейнасці дробна-буржуазных партый на Беларусі ў тым ліку і БСГ закранаюць у сваіх публікацыях С. Агурскі, Л. Каган, А. Кіржніц, С. Пінталь [1; 2; 23; 18; 19]. У сваіх працах яны прыходзяць да агульнай высновы, што БСГ была "дробна-буржуазнай нацыяналістычнай партыяй, якая ставіла нацыянальнае вызваленне Беларусі вышэй за ўсе" [2, с. 46] і што "палітычная ўдзельная вага Грамады, асабліва на Беларусі была надзвычай малая" [23, с. 51]. Аднак нельга згадзіцца з такімі сцвярджэннямі. БСГ не бачыла класавай дэферэнцыяцыі сярод беларускага грамадства, пралетарыят, сялянства і іншыя слаі працоўных яна аб'ядноўвала ў адну сацыяльную катэгорыю - працоўны народ, і ў роўнай ступені імкнула-



Рэпазіторый ВДУ

ся аперцiся i на рабочы клас, i на сялянства, i на iнтэлiгенцыю. Гэта наблiжала Грамаду да эсэраўскiх народнiцкiх палiтычных аб'яднанняў. Аўтар згодзен з тым, што У.I. Ленiн характарызаваў БСГ, як нацыянальную пртыю лева-народнiцкага напрамку [24, с. 315].

Шэраг цiкавых думак аб характары i асаблiвасцях нацыянальна-вызваленчага руху на Беларусi, аб стварэннi i дзейнасцi першай беларускай нацыянальнай партыi выказаў адзiн з арганiзатараў i кiраўнiкоў БСГ А. Луцкевiч у сваiх успамiнах аб працы першых беларускiх арганiзацый " За дваццаць пяць гадоў" [25], але не гледзячы на тое, што гэтая кнiга змяшчае ў сабе цiкавы фактычны матэрыял, яна, як i раней адзначаныя публiкацыi А. Бурбiса, напiсана не паводле дакументаў. Сам аўтар паведамляе , што пiсаў гэтыя ўспамiны, седзячы ў астрозе, не маючы нiякiх пiсаных цi друкаваных матэрыялаў" [25, с. 4].

Такiм чынам, лiтаратура, напiсаная ў 1920-я гады, якая тычыцца дзейнасцi БСГ, мае важнае значэнне для сучасных даследчыкаў. Напiсаны гэтыя рэчы вiдавочцамi i непасрэднымi ўдзельнiкамi колiшнiх падзей. Штосьцi ў публiкацыях розных аўтараў паўтараецца, штосьцi падаецца суб'ектыўна (у залежнасцi ад палiтычнай арыентацыi i акалiчнасцей асабiстага лёсу). Але гэта якраз i дазваляе супаставiць розныя меркаваннi, погляды i ацэнкi.

Неабходна заўважыць, што ў першае паслярэвалюцыйнае дзесяцiгоддзе даволi мiрна суiснавалi розныя школы i накiрункi даследаванняў, што спрыяла featureнабаковаму вывучэнню мiнулага Беларусi. Аднак такi стан рэчаў працягваўся нядоўга, актыўнае ўмяшанне партыйных структур i ўрада паступова прывялi да ўсталявання адной метадалогii – марксiсцкай. У вынiку гэтага гiстарычныя працы 1930-х г. характарызуюцца прамалiнейнасцю, схематызмам, якiя былi абумоўлены слабым веданнем тэорыi i фактаў гiсторыi. Маладоказныя, яны аднабакова адлюстроўвалi працэсы, падзеi i з'явы. Дзейнасць першай нацыянальнай беларускай партыi разглядалася толькi як дзейнасць нацыяналiстычнай контррэвалюцыйнай арганiзацыi [гл. 22].


1. Агурский, С. Очерки по истории революционного движения в Белоруссии (1863–1917) / С. Агурский. – Минск : Белгиз, 1928. – 348 с.
2. Агурскi, С. Роля дробна-буржуазных партый на Беларусi ў Кастрычнiцкай рэвалюцыi / С. Агурскi // Бальшавiк Беларусi. – 1927. – № 5. – С.69–74; № 6. – С. 45–50.
3. Ангаретис, З. Белорусская Социалистическая Громада / З. Ангаретис // Вперед. –1923. – № 2–3. – С. 64–67.
4. Беларусь. Нарысы гiсторыi, эканомiкi, культурнага i вызваленчага руху. – Менск : ЦВК БССР, 1924. – 321 с.
5. Бурбiс, А. Беларуская Сацыялiстычная Грамада ў першым перыядзе яе працы (1903–1907 гг.) / А. Бурбiс // Беларусь. Нарысы гiсторыi, эканомiкi, культурнага i рэвалюцыйнага руху. – Менск : ЦВК БССР, 1924. – С. 177–182.
6. Варонка, Я. Беларускi рух ад 1917 да 1920 году: Кароткi агляд / Я. Варонка. – Коўна, 1920. – 29 с.
7. Ж.З.Х. (З. Жылуновiч). Арганiзацыя сiл (Да гiсторыi Савецкае Беларусi) // Полымя. –1924. – № 2. – С. 163–179.
8. Ж.З.Х. Гiстарычны момант // Полымя. – 1924. – № 4. – С. 144–158.
9. Ж.З.Х. Уступамi да Акцябра // Полымя. – 1923. – № 5–6. – С.141–149; № 7–8. – С. 86–91.
10. Жылуновiч, З. Ад Кастрычнiка 1917 да лютага 1918 года / З. Жылуновiч // Полымя. –1924. – № 1. – С. 153–167.
11. Жылуновiч, З. Алесь Бурбiс (рэвалюцыйная характарыстыка) / З. Жылуновiч // Полымя. – 1927. – № 2. – С. 180–195.
12. Жылуновiч, З. Беларуская iнтэлiгенцыя ў гiстарычным аспекце / З. Жылуновiч // Полымя. – 1926. – № 6. – С.74–98.
13. Жылуновiч, З. Беларускiя секцыi РКП i стварэнне Беларускай Савецкай Рэспублiкi / З. Жылуновiч // Полымя. – 1928. – № 10. – С. 73–93.
14. Жылуновiч, З. Два бакi беларускага руху / З. Жылуновiч // Полымя. – 1923. – № 3–4. – С. 69–74.
15. Жылуновiч, З. З'езд беларускiх нацыянальных арганiзацый 25 сакавiка 1917 г. / З. Жылуновiч // Полымя. – 1925. – № 6. – С. 202–206.
16. Жылуновiч, З. Люты – Кастрычнiк у беларускiм нацыянальным руху / З. Жылуновiч // Беларусь. Нарысы гiсторыi, эканомiкi, культурнага i рэвалюцыйнага руху. – Менск : ЦВК БССР, 1924. – С. 182–194.
17. Iгнатоўскi, У. Вялiкi Кастрычнiк на Беларусi / У. Iгнатоўскi // Беларусь. Нарысы гiсторыi, эканомiкi, культурнага i рэвалюцыйнага руху. – Менск : ЦВК БССР, 1924. – С. 195–215.
18. Каган, Л. Люты – Кастрычнiк на Беларусi / Л. Каган // Полымя. – 1925. – № 7. – С. 82–96.
19. Пинталь, С. Остатки контрреволюционных партий в Белоруссии / С. Пинталь // Вперед. – 1923. – № 1. – С. 50–53.
20. Канчер, Е.С. Белорусский вопрос: сборник статей / Е.С. Канчер. – Петроград : Изд. Бел. отдела Комиссариата по делам национальностей С.К.С.О., 1919. – 132 с.
21. Канчер, Е.С. Из истории общественных, национальных и революционных движений белорусов. Часть II. История возникновения и деятельность организации. Выпуск первый / Е.С. Канчер // Неман. – 1993. – № 1. – С. 138–164.
22. Кастрычнiцкая рэвалюцыя на Беларусi: зборнiк успамiнаў i артыкулаў. – Мiнск: Дзярж. выд. Беларусi, 1934. – 120 с.
23. Кiржнiц, А. У няволi буржуазнага нацыяналiзму / А. Кiржнiц // Бальшавiк Беларусi. –1928. – № 1–3. – С. 50–62.
24. Ленин, В.И. К истории национальной программы в Австрии и России // Полн. собр. соч. – Т. 24. – С. 315.
25. Луцкевiч, А. За дваццаць пяць гадоў (1903–1918 гг.) / А. Луцкевiч. – Вiльня : Бел. выд. т-ва, 1928. – 52 с.
26. Мялешка, М. Барацьба Беларускай Сацыялiстычнай Грамады за зямлю ў 1905 г. / М. Мялешка // Полымя. – 1926. – № 1. – С. 152–159.
27. Новiна Ант. (А. Луцкевiч). Палiтычныя лозунгi беларускага руху // Наша Нiва: зборнiк. – Вiльня : Бел. выд. т-ва, 1920. – С. 2–14.
28. Пiчэта, У. Формы нацыянальнага й опозiцыйнага руху на Беларусi / У. Пiчэта // Полымя. – 1924. – № 2. – С. 142–146.
29. Стары Пiлiп (А. Бурбiс). Кароткi агляд беларускага нацыянальна-рэвалюцыйнага руху // Вестник Народного Комиссариата просвещения БССР. – 1921. – № 1. – С. 4–9; № 2. – С. 4–10.
30. Турук, Ф. Белорусское движение: Очерк истории национального движения белорусов / Ф. Турук. – М. : Госиздат, 1921. – 144 с.
31. Чарвякоў, А. За Савецкую Беларусь / А. Чарвякоў. – Менск, 1927. – 73 с.
32. Шлюбскi, А. Да гiсторыi БСГ / А. Шлюбскi // Полымя. – 1925. – № 5. – С. 157–163.
33. Шлюбскi, А. Да гiсторыi канфiскацыi "Нашай Долi" // А. Шлюбскi // Полымя. –1925. – № 5. – С. 157–163.
34. Шлюбскi, А. Канфiскацыя першага беларускага часопiса "Наша Доля"/ А. Шлюбскi // Савецкая Беларусь. – 1923. – № 153. – С. 3.




Репозиторий ВГУ